составить представление об уровне самооценки испытуемого; оценить степень его тревожности; определить склонность к агрессии, в том числе и вербальной; определить уровень коммуникабельности тестируемого, неуверенность и другие аспекты личности.

В результате интерпретации полученных в ходе исследований результатов было установлено, что у 53% испытуемых самооценка завышена, 47% респондентов несамостоятельны при принятии решений, что обусловлено перекладыванием проблем на других лиц, в частности, на родителей. Около 59% или 25 человек испытуемых обладают низким уровнем коммуникабельности, предпочитают не пускать посторонних в свой внутренний мир, что связано, в основном, с общением в виртуальном пространстве и проблемами при выстраивании коммуникационного процесса в реальной жизни. Что касается определения агрессии, то в основном она имеет вербальную направленность и диагностируется у 7% от числа испытуемых. 9% или 4 человека можно определить как гармонично развитые личности, преодолевшие внутренние комплексы и имеющие четкие планы на будущее.

Таким образом, результаты подобных исследований могут быть интересны участникам образовательного процесса, психологам и потенциальным работодателям и позволяют определить социальные отношения в студенческой группе, создать интерес у студентов к саморазвитию и понимание необходимости самосовершенствования, улучшить психологический климат в обследуемых группах и усовершенствовать подготовку к будущей профессиональной деятельности.

ЛИТЕРАТУРА

1. Батаршев, А.В. Психодиагностика в управлении: Практическое руководство: Учеб.-практич. пособие / А.В. Батаршев. - М.: Дело,2005. – 496 с.
2. Обозов, Н.Н. Типы личности, темперамент и характер / Н.Н. Обозов. - СПб.,1995.

УДК 378.663.091:811.161.3(476.6)

## ДА ПЫТАННЯ АБ КУЛЬТУРЫ ПРАФЕСІЙНАГА МАЎЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ (З ВОПЫТУ ВЫКЛАДАННЯ)

**А. М. Асіпчук**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт” (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца шляхі ўдасканалення культуры прафесійнага маўлення студэнтаў.
Ключавыя словы: культура маўлення, нормы беларускай літаратурнай мовы, чыстата маўлення, багацце маўлення.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

# К ВОПРОСУ О КУЛЬТУРЕ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ РЕЧИ СТУДЕНТОВ (ИЗ ОПЫТА ПРЕПОДАВАНИЯ)

**О. Н. Осипчук**
УО "Гродненский государственный аграрный университет" (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Аннотация. В статьерассматриваются пути совершенствования культуры профессиональной речи студентов.
Ключевые слова: культура речи, нормы белорусского литературного языка, чистота речи, богатство речи.

# ON THE ISSUE OF THE CULTURE OF STUDENTS' PROFESSIONAL SPEECH (FROM TEACHING EXPERIENCE)

**A. M. Asipchuk**
EI "Grodno State Agrarian University" (Belarus, Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The article deals with ways of mastering of students' professional speech.
Key words: culture of speech, Belarusian literary language norms, purity of speech, richness of speech.

Культура маўлення – адзін з паказчыкаў агульнай культуры чалавека. Менавіта падчас камунікатыўнага акта складваецца пэўнае ўражанне пра суразмоўца, узровень яго інтэлектуальнага развіцця, адметнасці мыслення. Незалежна ад узросту, адукацыі, сацыяльнага статусу чалавек, які імкнецца да самаўдасканалення, уважліва і беражліва ставіцца да *слова*.

Адукацыйны працэс прадугледжвае фарміраванне культуры маўлення на працягу ўсіх этапаў навучання: ад дзіцячага садка і да апошняга курса ВНУ. Сярод кампетэнцый, якімі павінен валодаць малады спецыяліст, адзначаецца і высокі ўзровень культуры прафесійнага маўлення.Дысцыпліна "Беларуская мова (прафесійная лексіка)"ставіць мэту "выпрацаваць і замацаваць практычныя ўменні і навыкі граматнага карыстання вуснай і пісьмовай мовай; развіць моўна-эстэтычны густ студэнтаў, звязаны з чысцінёй і правільнасцю мовы" [1, с. 6 – 7].

Яшчэ ў сярэдняй школе вучні знаёмяцца з паняццем "культура маўлення" і асноўнымі кампанентамі гэтага паняцця: *правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чыстата, багацце, выразнасць*. Задача выкладчыка ВНУ – захаваць пераемнасць у працэсе навучання, замацаваць і паглыбіць набытыя веды. У першую чаргу, на нашу думку, неабходна зрабіць акцэнт на трывалым засваенні асноўных нормаў беларускай літаратурнай мовы. Менавіта бездакорнае валоданне арфаэпічнымі, акцэнталагічнымі, арфаграфічнымі, лексічнымі, граматычнымі (марфалагічнымі і сінтаксічнымі), стылістычнымі, пунктуацыйнымі нормамі забяспечвае найбольш важны аспект культуры маўлення – *правільнасць*. Выкладчык павінен выявіць узровень валодання вусным і пісьмовым маўленнем студэнтаў, растлумачыць найбольш складаныя моманты (напрыклад, цяжкія выпадкіправапісу апошняй рэдакцыі), навучыць карыстацца галоўнымі нарматыўнымі крыніцамі –акадэмічнымі слоўнікамі і



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

граматыкамі, адначасова выпрацоўваючы крытычнае стаўленне да аўтарскіх і электронных слоўнікаў. Як слушна заўважае прафесар І.Я. Лепешаў, "амаль усе мы прывыклі ставіцца з вялікай пашанай да філалагічных слоўнікаў як да нашых сяброў і надзейных памочнікаў. Але часам можа надарыцца, што яны не заўсёды садзейнічаюць культуры маўлення"[2, с. 80].

Для ўдасканалення культуры прафесійнага маўлення вучэбнай праграмай па дысцыпліне "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" прадугледжаны такія віды працы, як напісанне рэфератаў, выступленне з паведамленнямі,вусныя і пісьмовыя выказванні. З мэтай развіцця камунікатыўных навыкаў на роднай мове можна прапанаваць правядзенне дыспутаў на актуальныя тэмы, абыгрыванне пэўных сітуацый і інш. Пры гэтым выкладчыку неабходна прааналізаваць тыповыя памылкі падчас публічных выступленняў студэнтаў, звярнуць увагу на *чыстату* і *багацце* маўлення. Т.І. Тамашэвіч пра чыстату маўлення кажа наступнае: "Безумоўна, кожны сумленны носьбіт мовы павінен адчуваць маральную адказнасць за яе чыстату, усведамляць значэнне роднага слова ў развіцці грамадства, яго культуры. Чыстата маўлення – гэта маўленне без пазалітаратурных сродкаў. На жаль, яно сёння знявечана дыялектнымі прымесямі, варварызмамі, лаянкавымі словамі, жарганізмамі і інш. і патрабуе неадкладных "лекаў"[4, с. 65 – 66]. Наўрад ці можна знайсці носьбіта мовы з абсалютна чыстым маўленнем. Толькі са словамі-паразітамі (накшталт *ну*, *значыць*, *значыцца*, *так*, *так бы мовіць*, *вось* і інш.) або асобнымі гукамі-паразітамі (тыпу *э-э-э*, *гм*, *а-а* і інш.), якія рэжуць слых, мы сутыкаемся на кожным кроку. Не заўсёды чалавек (а ў дадзеным выпадку размова ідзе пра студэнтаў) заўважае свае заганы ў маўленні, што "паралізавана" словамі-паразітамі, якія паўтараюцца праз кожныя тры-чатыры словы. Тут патрэбна падказка збоку, падказка на папраўку" [4, с. 66]. Выкладчык павінен не проста ўказаць на агрэхі, што псуюць агульнае ўражанне аб вуснай прамове (напрыклад, падчас выступлення з дакладам, абароны курсавога праекта ці дыпломнай працы), а параіць будучым спецыялістам увжліва сачыць за выказваннем думак, пазбягаць беспадстаўнага ўжывання тых ці іншых лексічных адзінак, якія засмечваюць маўленне.

Што да багацця маўлення, то яно, як зазначае Б.А. Плотнікаў, "лучыцца перадусім з разнастайнасцю ўжытых моўных сродкаў і з як можна радзейшым паўтарэннем адных і тых жа слоў і выразаў. … Выказванне ж адной і той жа думкі рознымі і шматстайнымі моўнымі сродкамі, як правіла, з'яўляецца вынікам яе многааспектнай і глыбокай асэнсаванасці, добрай засвоенасці, служыць надзейнай падставай для таго, каб вытлумачыць яе ясна, зразумела, данесці па-рознаму ў залежнасці ад складу адрасатаў, аўдыторыі" [3, с. 85 – 86]. Як паказвае практыка, беларускамоўны лексічны запас студэнтаў даволі бедны. Гэта абумоўлена пэўнымі фактарамі. На сённяшні дзень беларуская мова фактычна (а не фармальна) не з'яўляецца сродкам зносін нацыі, абмежавана выкарыстоўваецца ў розных сферах грамадства (справаводства, адукацыя, сродкі масавай інфармацыі і г. д.), не мае рэальнага статусу мовы тытульнай нацыі. Як вынік – нізкая матывацыя ў студэнтаў валодаць роднай мовай у цэлым і ўзбагачацьсваё маўленне беларускамоўнай лексікайу прыватнасці. Перад выкладчыкам паўстае складаная задача – зацікавіць студэнтаў у штодзённым выкарыстанні беларускай мовы (граматнай, чыстай,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

багатай), імкнуцца падняць прэстыж роднага слова ў нашым грамадстве менавіта праз маладое пакаленне.

Такім чынам, удасканаленне маўлення студэнтаў павінна стаць неад’емнай часткай навучальнага працэсу ў ВНУ, садзейнічаць фарміраванню высокаадукаванай асобы.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская мова (прафесійная лексіка): тыпавая вучэб. праграма для выш. навуч. устаноў / склад.: М.Р. Прыгодзіч, Г.І. Кулеш, Н.П. Лобань; пад рэд. М.Р. Прыгодзіча. – Мінск: РІВШ, 2008. – 28 с.
2. Лепешаў, І.Я. Перад змяркканнем: зб. артыкулаў / Іван Лепешаў. – Гродна: “ЮрСаПринт”, 2013. – 232 с.
3. Плотнікаў, Б.А. Кіраўніку аб мове / Б.А. Плотнікаў. – Мінск: Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, 2001. – 126 с.
4. Тамашэвіч, Т.І. Культура і тэхніка маўлення: Дапам. / Т.І. Тамашэвіч; Пад рэд. І.Я. Лепешава. – ГрДУ, 2003. – 137 с.

УДК 355.233.231.1 – 057.875

## ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ ОСНОВЫ ПАТРИОТИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ СТУДЕНТОВ

**Ф. С. Приходько, Е. Е. Дубежинская**
УО «Белорусская государственная сельскохозяйственная академия» (Республика Беларусь, 213407, г. Горки, ул. Мичурина, 5; e-mail: monitoring@baa.by)

Аннотация. В статье раскрываются смысл и задачи психолого-педагогического сопровождения патриотического становления личности студента. Представлены направления деятельности воспитателей на каждом этапе развития сознания студентов.
Ключевые слова: воспитание, личность, патриотизм, сознание, гордость, активность, гражданственность, толерантность.

## PSYCHOLOGICAL AND PEDAGOGICAL FOUNDATIONS PATRIOTIC EDUCATION OF STUDENTS

**F. S. Prikhodko, E. E. Dobujinsky**
EE «Belarusian state agricultural Academy» (Republic of Belarus, 213407, Gorki, Michurina str., 5; e-mail: monitoring@baa.by)

Summary. The article reveals the meaning and objectives of psychological and pedagogical support for the Patriotic personality of the student. Presents directions for educators at every stage of the development of consciousness of students.
Key words: education, personality, patriotism, consciousness, pride, activism, citizenship, tolerance.

В условиях современных социально-экономических и политических реалий, со всей остротой встает проблема патриотического воспитания будущих специалистов. Собственно, история подтверждает важность такого



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ